Дзяржаўная установа культуры
“Пінская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”
Аддзел бібліятэчнага маркетынгу

# “На голас музы…”

*Зборнік па выніках раённага агляду-конкурсу на лепшае тэатралізаванае прадстаўленне вершаў Яўгеніі Янішчыц, прысвечанага 70-годдзю з дня нараджэння паэтэсы*



Пінск, 2018

ПАСТАНОВА
Савета аддзела ідэалагічнай работы,
культуры і па справах моладзі
Пінскага райвыканкама
ад «22» 02 2018 г. № 2
г. Пінск

Аб правядзенні сярод бібліятэк
дзяржаўнай установы культуры "Пінская
раённая цэнтралізаваная бібліятэчная
сістэма" раённага агляду-конкурсу на
лепшае тэатралізаванае прадстаўленне
вершаў Яўгеніі Янішчыц
"На голас музы"

З мэтай азнаменавання 70-годдзя з дня нараджэння Яўгеніі Янішчыц, папулярызацыі творчай спадчыны паэтэсы, прывіцця любові да роднай мовы і культуры Савет аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Раённы агляд-конкурс на лепшае тэатралізаванае прадстаўленне вершаў Яўгеніі Янішчыц "На голас музы" правесці ў сакавіку 2018 года.

2. Зацвердзіць Палажэнне аб конкурсе, склад журы (дадаткі 1,2).

3. Аддзелу бібліятэчнага маркетынгу ЦРБ імя Я.Янішчыц забяспечыць удзел усіх бібліятэк раёна ў аглядзе-конкурсе на лепшае тэатралізаванае прадстаўленне вершаў Яўгеніі Янішчыц "На голас музы".

4. Адказнасць за правядзенне раённага агляду-конкурсу сярод бібліятэк ускласці на дырэктара дзяржаўнай установы культуры "Пінская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма" А.І.Антащук.

Старшыня Савета,
начальнік аддзела
ідэалагічнай работы, культуры
і па справах моладзі
Пінскага райвыканкама Л.В.Галавач

ДАДАТАК №1

да Пастановы Савета аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Пінскага райвыканкама ад "22" 02 2018г.

# ПАЛАЖЭННЕ

аб правядзенні сярод бібліятэк дзяржаўнай установы культуры "Пінская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма" раённага агляду-конкурсу на лепшае тэатралізаванае прадстаўленне вершаў Яўгеніі Янішчыц "На голас музы"

## I. Асноўныя мэты і задачы конкурсу:

- азнаменаванне 70-годдзя з дня нараджэння Яўгеніі Янішчыц, беларускай паэтэсы;
- актывізацыя дзейнасці бібліятэк па папулярызацыі творчай спадчыны паэтэсы;
- умацаванне ролі бібліятэк як цэнтраў краязнаўчай інфармацыі;
- адраджэнне цікавасці карыстальнікаў бібліятэк да твораў Яўгеніі Янішчыц праз развіццё фантазіі і творчых здольнасцей бібліятэкараў.

## II. Умовы і парадак правядзення конкурсу:

1. У раённым аглядзе-конкурсе прымаюць удзел усе бібліятэкі дзяржаўнай установы культуры "Пінская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма".
2. Конкурс будзе праходзіць па зонах:
   1-я зона: 23.03.2018г.
   Бібліятэкі Плешчыцкага, Лапацінскага, Ласіцкага, Барычавіцкага, Калавуравіцкага, Хойнаўскага, Дубайскага сельвыканкамаў.
   2-я зона: 26.03.2018г.
   Бібліятэкі Бабрыкоўскага, Лагішынскага, Валішчанскага, Лышчанскага, Мерчыцкага, Парэцкага, Ставокскага сельвыканкамаў, Пасяніцкая сельская бібліятэка.
   3-я зона: 28.03.2018г.
   Бібліятэкі Пінкавіцкага, Парахонскага сельвыканкамаў, ЦРБ імя Я.Янішчыц, Аснежыцкая сельская бібліятэка.
   4-я зона: 29.03.2018г.
   Бібліятэкі Гарадзішчанскага, Сошненскага, Н-Дворскага, П-Загародскага, Бярозавіцкага, Ахоўскага, Малоткавіцкага сельвыканкамаў.

3. Тэкст сцэнарыя прадстаўляецца журы.
4. Працягласць паказу не больш 10 хвілін.

### III. Крытэрыі ацэнкі:

- высокі мастацкі, эстэтычны, інфармацыйны ўзровень сцэнарнага матэрыялу;
- выразнасць і правільнасць мовы;
- творчы падыход да тэатралізаванага прадстаўлення;
- граматнасць, прафесійны ўзровень;
- выканаўчае майстэрства і артыстызм удзельнікаў;
- музычнае і нагляднае афармленне.

### IV. Падвядзенне вынікаў і ўзнагароджванне пераможцаў:

1. Падвядзенне вынікаў і ўзнагароджванне пераможцаў адбудзецца на раённым семінары-практыкуме "Работа с библиотечным фондом: формирование, сохранность и использование" на базе Аснежыцкай СБ.

2. Пераможцы (1, 2, 3 месца) ў аглядзе-конкурсе ўзнагароджваюцца дыпломамі аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Піскага райвыканкама і грашовымі прэміямі.

3. Лепшыя матэрыялы будуць апублікаваны ў інфармацыйна-рэкламным бюлетэні "Кругозор" і зборніку "На голас музы".

ДАДАТАК №2

да Пастановы Савета аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Пінскага райвыканкама аб правядзенні сярод бібліятэк дзяржаўнай установы культуры “Пінская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма” раённага агляду-конкурсу на лепшае тэатралізаванае прадстаўленне вершаў Яўгеніі Янішчыц “На голас музы” ад “22” 02 2018г.

## Склад журы:

па правядзенні раённага агляду-конкурсу на лепшае тэатралізаванае прадстаўленне вершаў Яўгеніі Янішчыц “На голас музы”

1. Галавач Л.В. – начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Пінскага райвыканкама.

2. Анташук А.І. – дырэктар дзяржаўнай установы культуры “Пінская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”.

3. Знавец Н.В. – дырэктар дзяржаўнай установы культуры “Пінская раённая цэнтралізаваная клубная сістэма”.

4. Карповіч В.Ю. – рэжысёр арганізацыйна-метадычнага цэнтра.

5. Міхалевіч К.Л. – загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу ЦРБ імя Я.Янішчыц.

6. Папіціч Л.І. – галоўны бібліятэкар аддзела бібліятэчнага маркетынгу ЦРБ імя Я.Янішчыц.

7. Жылевіч В.І. – метадыст 1-й катэгорыі аддзела бібліятэчнага маркетынгу ЦРБ імя Я.Янішчыц.

ПАСТАНОВА
Савета аддзела ідэалагічнай работы,
культуры і па справах моладзі
Пінскага райвыканкама
ад «22» 02 2018 г. № 2
г. Пінск

Аб выніках правядзення сярод бібліятэк
дзяржаўнай установы культуры "Пінская
раённая цэнтралізаваная бібліятэчная
сістэма" раённага агляду-конкурсу на
лепшае тэатралізаванае прадстаўленне
вершаў Яўгеніі Янішчыц
"На голас музы"

З мэтай азнаменавання 70-годдзя з дня нараджэння Яўгеніі Янішчыц, папулярызацыі творчай спадчыны паэтэсы, прывіцця любові да роднай мовы дзяржаўная установа культуры "Пінская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма" правяла раённы-агляд конкурс на лепшае тэатралізаванае прадстаўленне вершаў Яўгеніі Янішчыц "На голас музы".

У раённам аглядзе-конкурсе на лепшае тэатралізаванае прадстаўленне вершаў Яўгеніі Янішчыц "На голас музы" прынялі ўдзел 39 бібліятэк.

Разглядзеўшы конкурсныя матэрыялы Савет аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Пінскага райвыканкама ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Прызнаць пераможцамі раённага агляду-конкурсу:

- Бабрыкоўскую сельскую бібліятэку (бібліятэкар Міхалевіч А.М.) - I месца сярод бібліятэк дзяржаўнай установы культуры "Пінская раённая цэнтралізаванная бібліятэчная сістэма"; *за тэатралізаванае прадстаўленнне вершаў Яўгеніі Янішчыц "Маці" і "Ты вучыла мяне сеяць жыта і лён".*
- Навадворскую сельскую бібліятэку (бібліятэкар Гузарэвіч А.І.) - II месца сярод бібліятэк дзяржаўнай установы культуры "Пінская раённая цэнтралізаванная бібліятэчная сістэма"; *за тэатралізаванае прадстаўленнне верша Яўгеніі Янішчыц "Я вас люблю".*
- Аддзел абслугоўвання і інфармацыі цэнтральнай раённай бібліятэкі імя Яўгеніі Янішчыц (загадчык аддзелам Самуйлік І. І.) - III месца сярод бібліятэк дзяржаўнай установы культуры "Пінская раённая

цэнтралізаванная бібліятэчная сістэма”; *за тэатралізаванае прадстаўленнне верша Яўгеніі Янішчыц “У калыханку сыну”.*

2. Адзначыць Лістамі падзякі:

- Пінкавіцкую сельскую бібліятэку (заг. Палюховіч І.А);
- Садоўскую сельскую бібліятэку (бібліятэкар Грамада А.А.);
- Лагішынскую гарпасялковую бібліятэку (заг. Гусіна Л.І.);
- Дамашыцкую сельскую бібліятэку сямейнага чытання (бібліятэкар Селюжыцкая С.І.);
- Кашавіцкую сельскую бібліятэку (бібліятэкар Навумавец Н.В.);
- Парахонскую сельскую бібліятэку (заг. Лосіч С.П.);
- Плешчыцкую сельскую бібліятэку (бібліятэкар Шпакоўская Л.У.);
- Стытычаўскую сельскую бібліятэку (бібліятэкар Ігнацюк Н.А.)
- Валішчанскую сельскую бібліятэку (бібліятэкар Лазюк С.І.).

Старшыня Савета,
начальнік аддзела
ідэалагічнай работы,
культуры і па справах моладзі
Пінскага райвыканкама Л.В. Галавач

# Бабрыкоўская сельская бібліятэка







## *Тэатралізаванае прадстаўленне вершаў Яўгеніі Янішчыц*
## *“Маці” і “Ты вучыла мяне сеяць жыта і лён”*

**Афармленне залы:** *сцэна ўпрыгожана ў нацыянальным стылі. Афармлена кніжная выстава “Палеская ластаўка”. Ціха гучыць музыка.*

**Вядучы:** Добры дзень, паважаныя сябры! Бабрыкоўская сельская бібліятэка запрашае вас на тэатралізаванае прадстаўленне вершаў Яўгеніі Янішчыц. Вобраз маці не мінуў у сваёй творчасці ні адзін значны пісьменнік ці паэт. Гэты вобраз авеяны самай высокай паэзіяй. Ён называецца кароткім, але вельмі значным і дарагім для чалавека словам “маці”. Жыццёвы лёс маці – своеасаблівы ўрок душэўнай трываласці, вышэйшы суд сумлення, перад якім паэтка трымае шчырую споведзь. Навуку гэтую засвоіла яна ад маці Марыі Андрэеўны. Марыю Андрэеўну, маці паэткі, напаткаў у многім тыповы лёс палескай жанчыны-працаўніцы. Яна да стомы працавала ў калгасе, цягнула ўласную гаспадарку, умела рабіць любую справу не горш за мужчын. З ранку да ночы яе круціў вір штодзённых клопатаў. Паэтка спагадала матчынай нялёгкай удовай долі, імкнулася глыбока адчуць боль роднага сэрца.

**Жэня Янішчыц:**
Не, усё-ткі не я: мама мая – паэтэса
Са шчымлівай грудною песняй,
З клопатамі пякучымі
Пра поле, балацявіну;
Пра тое, як спорна вучыцца
У горадзе меншаму сыну;
Пра старое гняздо буслішына,
Што разбурыў вятрыска...
Бачу: паўстала сцішана
Па-над айчынным прысакам
З пяцімесячным на руках
У скаромнай чорнай спадніцы.
Маму палохае страх –
Як жыць адной маладзіцы.
Мільгае за поўнач акно яе –
Удовай не спіцца:
Машынка стукоча.
Абшывае сваю Велясніцу:
Каму – за пакосы, каму – за каня,
Каму – за шчырае дзякуй. І мама пяе…

*Янішчыц, Я. Мама / Яўгенія Янішчыц // На беразе пляча. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1980. – С. 7-8.*

***Гучыць песня па матывам верша “Ты вучыла мяне сеяць жыта і лён”***
*(Маці спявае, чытаючы ліст ад Жэні)*

**Маці:** *«Дзень добры, мама! Гэта зноўку я, уся твая гаркота і надзея”*

Ты вучыла мяне сеяць жыта і лён
І цярплівасці вечнай – уголас не плакаць.
Апынуся калі сярод чорных варон –
Я памру, ды не буду па-іхняму каркаць.

Вось трывожна вядзерца нясу, як тады,
Як вучыла, нясу. Я нясу, каб суседка
Не сказала, што нават звычайнай вады
Прынясці не умее, не заліўшы сукенку.

Пішаш: «Век мой пражыты. Наперадзе — твой.
За мяне не хвалюйся. Я буду здаровай
Да апошняй вячэрняй зары палявой
І грыбочка апошняга ў нашай дуброве».

*Янішчыц, Я. Ты вучыла мяне сеяць жыта і лён / Яўгенія Янішчыц // Ясельда. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1978. – С.22.*

*(Ліст ад маці)*

**Маці:** Добры дзень, маё дзіцятка! «...дома ўсё па-ранейшаму, па-старому. Працы хапае, пакуль буду жыць. Цяжка, канешне, ў хаце аднаму. Дзякуй Паўлу, памог дзялянку скасіць. Мала цяпер бескарысных людзей. Тры дні сядзелі ў нас фальклярысты, запісвалі – відаць, апошнія з галасоў. Наспявалі ім бабы, аж сцены разносіла. А песні такія – хоць кармі салаўя. Прашу, болей глядзі за сабою. Ведаю, адзінота – яна гняце. Назбірала табе дзівасілу і зверабою, а то свецішся ўся, як абраз у куце. Думай усё ж за сабою найперша, глядзі на свет гэты больш весялей. Халера пабрала б гэтыя вершы, без іх мо была б у жыцці шчаслівей. Мо я й не тое табе парадзіла, табе, канешне ж, лепей відаць…”.

*(Прыходзяць суседкі)*

**Суседка:** Дзень добры, суседачка! Чым займаешся?

**Маці:** Ды вось кашулю шыю, каб аддзячыць Паўла за тое, што дзялянку скасіў. Ліста ад Жэні доўга няма, хвалююся. Сядайце жаночкі! Частуйцеся чым бог паслаў. Напэўна стаміліся.

**Суседка:** А гармонік яшчэ не аддала Хвядосіку?

**Маці:** Пакуль не аддала … шкада. Але ж абяцала, таму абавязкова аддам. Ой, жаночкі, плакала, плакала, ды і жыццё адзінакава, а стала спяваці стаў бог памагаці. Мо заспяваем Женіну песню.

***Гучыць беларуская народная песня “Шумяць вербы каля грэблі”***

**Маці:** Засумавалі мы нешта. Ганулька, бяры гармонік ды зайграй сербіянку!

Гэй ты, песня-весялушка:
Сум з вачэй, цяжар з плячэй!
Вось і сэрца, быццам птушка,

Стала лётаць весялей.

*(Стук у дзверы. Прыходзіць паштальён прыносіць ліст. Маці чытае)*

**Маці:**
Цвёрда мною завучан натруджаны крок
Твой, якому навек ужо не саступіцца.
І душа мая чыста, нібы матылёк,
На агонь вылятае, ды агню не баіцца.
Мама, сею не жыта я, сею не лён.
Але з лёну і жыта я словы складаю.
І калі ўглядаюся ў парасткі дзён –
Чую крокі твае. І свае вымяраю.

*Янішчыц, Я. Ты вучыла мяне сеяць жыта і лён / Яўгенія Янішчыц // Ясельда. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1978. – С.22.*

Спіс выкарыстанай літаратуры:


1. Гніламёдаў, У.В. Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя / У.В. Гніламёдаў. – Мінск, 2003. – С. 67-69.
2. Янішчыц, Я. Мама / Яўгенія Янішчыц // На беразе пляча. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1980. – С. 7-8.
3. Янішчыц, Я. Ты вучыла мяне сеяць жыта і лён / Яўгенія Янішчыц // Ясельда. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1978. – С. 22.
4. Яўгенія Янішчыц: творы, жыццяпіс, каментарыі. У 4 т. Т.1 / уклад.: С.У. Калядка, Т.П. Аўсяннікава. – Мінск: Беларуская навука, 2016. – С.137-142.

# Навадворская сельская бібліятэка



## *Тэатралізаванае прадстаўленне верша Яўгеніі Янішчыц*
## *“Я вас люблю”*

**Афармленне залы:** *сцэна ўпрыгожана ў нацыянальным стылі. Афармлена кніжная выстава “Паэтычная спадчына Яўгеніі Янішчыц”. Ціха гучыць музыка. Выходзіць дзяўчына.*

**Дзяўчына:**
«Я вас люблю» – няма каму сказаць?
А мне ў любві да скону не змыліцца:
Я вас люблю, лясы і сенажаць,
Старая вёска, новая сталіца.

Мы ў сэрцы носім радасць і грахі.
І распраўляем пераможна крылы.
Я вас люблю, айчынныя шляхі,
Я помню вас, забытыя магілы!

І знаю: дзень пражыты недарма,
Калі перажываю і хварэю,
Калі прад імянной сцяной – сама,
Нібы сцяна, ад жудасці бялею.

Падлесак – сын мне, бор вячысты – друг.
Зіма зажурыць – развяселіць лета.
Цябе люблю, патрыярхальны плуг,
Цябе – у страшным космасе, ракета.

Люблю я вас, сівыя мацяркі,
Што аж дагэтуль гояць боль па дзецях,
Што вы мне ўсе – нібы мацерыкі,
Якія хочуць міру на планеце.

*Янішчыц, Я. Я вас люблю / Яўгенія Янішчыц // Пара любові і жалю. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1983. – С. 8.*

# Цэнтральная раённая бібліятэка імя Я. Янішчыц












## *Тэатралізаванае прадстаўленне верша Яўгеніі Янішчыц*
## *“У калыханку сыну”*

**Афармленне залы:** *сцэна стылізавана пад сялянскую хату. Аформлена кніжная выстава “Голас палескай душы”. Выходзіць маладая жанчына, трымаючы на руках маленькае дзіця. Гучыць беларуская калыханка. Жанчына калыша дзіця на руках.*

**Жанчына:**
Свет мой – голенькі ды босы,
Мой бялюткі бацянок,
Засынаеш, як дарослы, –
Пад галоўку кулачок.

Спі... Зырчэйшая за лотаць
Узышла зара ў акне.
Хто нас можа запалохаць,
Калі ты ўсміхнуўся мне?

І сама я на паўслове
Заціхаю. Ноч... Спакой...
Спі, твой ранaчак ружовы
І блакітны вечар твой.

Спі, мой сыне, спі, мой болю,
Спі, крыло майго жыцця...
Я й сама цяпер з табою,
Як вясёлае дзіця.

*Янішчыц, Я. У калыханку сыну / Яўгенія Янішчыц // Дзень вечаровы. – Мінск: астацкая літаратура, 1974. – С.57.*

# Дамашыцкая сельская бібліятэка сямейнага чытання







## *Тэатралізаванае прадстаўленне верша Яўгеніі Янішчыц*
## *“Застаюся каханай”*

**Афармленне залы:** *сцэна стылізавана пад сялянскую хату. Гучыць музыка, на сцэну выходзяць дзяўчынка і хлопчык.*

**Дзяўчынка:**
Страшна ўвечары жыць
З незагоенай ранай.
Ты сказаў:

**Хлопчык:** «Адбаліць,
Заставайся каханай».

**Дзяўчынка:**
Страшна ноччу мне быць
З гаркатой апантанай.
Ты сказаў:

**Хлопчык:** «Адшчыміць,
Заставайся каханай».

**Дзяўчынка:**
Ах, нуда — не бяда
У цішыні расстралянай.
На праломе ільда
Застаюся каханай.

Валуны ды вуглы,
Золь дарогі калянай.
У праёме імглы
Застаюся каханай!

*Янішчыц, Я. Застаюся каханай! / Яўгенія Янішчыц // Каліна зімы. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1987. – С.185.*

# Кашавіцкая
# сельская
# бібліятэка





## *Тэатралізаванае прадстаўленне верша Яўгеніі Янішчыц “Ты пакліч мяне. Пазаві”*

**Афармленне залы:** *сцэна ўпрыгожана ў нацыянальным стылі. Ціха гучыць музыка. На сцэну выходзяць дзяўчына і хлопец.*

**Хлопец:**
Ты пакліч мяне. Пазаві.
Там заблудзімся ў хмельных травах.
Пачынаецца ўсё з любві,
Нават самая простая ява.
**Дзяўчына:**
І тады душой не крыві
На дарозе жыцця шырокай.
Пачынаецца ўсё з любві –
Першы поспех і першыя крокі.
**Хлопец:**
Прыручаюцца салаўі,
І змяняюцца краявіды
Пачынаецца ўсё з любві –
Нават ненавісць і агіда...
**Дзяўчына:**
Ты пакліч мяне. Пазаві.
Сто дарог за маімі плячыма,
Пачынаецца ўсё з любві,
А інакш і жыць немагчыма.

*Янішчыц, Я. Ты пакліч мяне. Пазаві / Яўгенія Янішчыц // Выбранае. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2000. – С.186.*

***Гучыць песня “Старана мая азёрная”. Словы Я.Янішчыц, музыка З. Яўтуховіча.***

Старана мая былінная,
Песня матчына. Радно.
...Караваі магазінныя.
...Магазіннае віно.

Ці лячу сюды параіцца,
Ці душу сваю пачуць, —
Белы гусі, белы чаіцы
Гаману са мной вядуць.

**Прыпеў:**
Дай ласкавую руку...
Старана мая азёрная,

Хата светлая, прасторная.
Двор у белым вішняку.

Старана мая харошая,
Варажэі, свацці...
Не, не ўсе лугі пакошаны!
Не ўсе сенажаці!

Ці лячу сюды параіцца,
Ці душу сваю пачуць, —
Белы гусі, белы чаіцы
Гаману са мной вядуць.

**Прыпеў:**
Дай ласкавую руку...
Старана мая азёрная,
Хата светлая, прасторная.
Двор у белым вішняку.

*Янішчыц, Я. Старана мая азёрная / Яўгенія Янішчыц // Пара любові і жалю. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1983. – С. 43.*

Спіс выкарыстанай літаратуры:


1. Янішчыц, Я. Старана мая азёрная / Яўгенія Янішчыц // Пара любові і жалю. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1983. – С. 43.
2. Янішчыц, Я. Ты пакліч мяне. Пазаві / Яўгенія Янішчыц // Выбранае. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2000. – С. 186.
3. Яўгенія Янішчыц: творы, жыццяпіс, каментарыі / уклад.: С.У. Калядка, Т.П. Аўсяннікава. – Мінск: Беларуская навука, 2016. – С. 80-243.

# Садоўская сельская бібліятэка








## *Тэатралізаванае прадстаўленне верша Яўгеніі Янішчыц "Пралескі"*

**Афармленне залы:** *сцэна стылізавана пад сялянскую хату. Гучыць музыка. Выходзяць дзяўчынка.*

**Дзяўчынка:**
Мне гэтак светла на душы,
Хоць і захмаран край палескі.
Але ў гліняным гладышы
Пагодныя ўзышлі пралескі.

Клапотна іх ля раўчука,
Дзе парыжэлыя сумёты,
Шукала матчына рука
На светлы дзень майго звароту.

Як свята хутка настае,
З плячэй гады зняла дарога.
Цвітуць настольнік на стале,
І падаконнік, і падлога.

Аб тым, што дзень ці два гасціць
І дыхаць тым паветрам свежым,
Сказаць баюся, бы ўпусціць
Гладыш са шчасцем беласнежным.

*Янішчыц, Я. Пралескі / Яўгенія Янішчыц // Ясельда. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1978. – С. 7.*

# Пінкавіцкая сельская бібліятэка







## *Тэатралізаванае прадстаўленне верша Яўгеніі Янішчыц "Цётка Воля"*

**Афармленне залы:** *сцэна ўпрыгожана ў нацыянальным стылі як сялянская хата. Выходзіць жанчына, папраўляе сурвэтку на этажэрцы, фіранкі на вокнах, выцірае пыл з куфра, дастае адтуль фотаальбом і разглядае яго. За сцэнай гучыць голас чытальніка.*

**Чытальнік:**
І я, напэўна, не ўседжу.
Займуся садам і раллёй,
Калі на нейкі час суседжу
З аціхлай хатаю тваёй.

Ах, цётка Воля!
На ўспацелым
Ілбе
    дзве хвалі сівізны…
Раслі, гулі ды паляцелі
Па свету беламу сыны!
Калі, у які далёкі вырай
Твая зляцела маладосць?..
Ты кажаш:

**Цётка Воля** *(разглядаючы фотаздымкі ў альбоме)*:
Сын жыве ў Сібіры,
Жанаты… дом…
                і дзеткі ёсць.

**Чытальнік:**
Гляджу, а твар не праясніўся,
Маршчынкі зноў на лоб бягуць:

**Цётка Воля:**
Другі таксама ажаніўся…
Дзесь за граніцаю жывуць…

**Чытальнік:**
Ах, цётка Воля!
                Цётка Воля
Слязу змахнула рукавом:

**Цётка Воля:**
Прасіла я… але і Коля
Пайшоў… Пакінуў родны дом.

**Чытальнік:**
А слова боль увесь не змесціць.

Да воч паднесла зноў рукаў:

**Цётка Воля:**
Мо хоць старэйшы б быў на месцы,
Ды ля Берліна… голаў склаў…

*Янішчыц, Я. Цётка Воля / Яўгенія Янішчыц // Дзень вечаровы. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1974. – С. 65-67.*

# Парахонская сельская бібліятэка







## *Тэатралізаванае прадстаўленне верша Яўгеніі Янішчыц "Ластаўка вясны"*

**Афармленне залы:** *сцэна ўпрыгожана ў нацыянальным стылі. Аформлена кніжная выстава "Палеская ластаўка". У цэнтры сцэны ўстаноўлены экран. Ціха гучыць музыка.*

**Вядучы:** Жэні Янішчыц споўнілася б 70 гадоў. Узнёслая, акрылёная, яна між волі прыцягвала ўвагу. Іскрыстай і светлай была яе ўсмешка. І сама Жэня нібы поўнілася святлом.

**Вядучы:** Пра лірыку Яўгеніі Янішчыц гаварыць цяжка, бо кожны верш і радок настолькі арганічна ўваходзіць у яе, што вылучыць нешта асноўнае, каб не парушыць цэласнасць паэтычнага ўспрымання амаль немагчыма.

*(на фоне верша і музыкі выконваецца танец)*

**Чытальнік:**
І дождж, і гром, і несціханы вецер,
І першы клейкі лісцік выразны!
...Абуджваюць балючае дасвецце
Кахання сад і ластаўка вясны.
Яшчэ з табой мы павяснуем, доля,
Бо соты раз, як позва адкрыцця, —
У светлыні агромленага голля
Кахання май і ластаўка жыцця.
Вясна, агонь зялёнага азарту,
Люблю твайго размаху крыгаход...
Зялёны сад — ён стане жоўтым заўтра,
Але нальецца тайнай сілай плод!
Аціхне шум. Ацяжалее крона.
Ды зноў успыхне лісцік выразны.
І блаславіць нашчадак акрылёна
Кахання сад і ластаўку вясны.

*Янішчыц, Я. Кахання сад і ластаўка вясны / Яўгенія Янішчыц // Каліна зімы. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1987. – С. 162.*

**Вядучы:** Яўгеніі Янішчыц няма сярод нас, 25 лістапада 1988-га года жыццё Яўгеніі Янішчыц трагічна абарвалася, але яе паэзіія заўсёды будзе патрэбна людзям. І між волі прыгадваюцца радкі развітальнага верша Г.Бураўкіна.

Ластаўка палеская, навошта
Гэтак рана адляцела ты?
Будзе вечна блізкім рэхам
Звінець твой голас малады

*Гучыць песня "Да сустрэчы".*
*Словы Я.Янішчыц, музыка М.Яцкоў.*

Да сустрэчы.
Да сустрэчы.
Белы вечер.
                Сіні дзень.
Ходзіць сонца па зарэччы
Па калені ў вадзе.
Над ракою дзве вярбіны –
Дзве журботныя сястры.
Па-над цёплай лугавінай
Ноч запальвае кастры.
Старажытных соснаў веча.
Птушак грай і смех людзей.
Да сустрэчы.
                Да сустрэчы.
Сіні вечар.
                Белы дзень.

*Янішчыц, Я. Да сустрэчы / Яўгенія Янішчыц // Выбранае. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2000. – С. 30.*

Спіс выкарыстанай літаратуры:

1. Янішчыц, Я. Да сустрэчы / Яўгенія Янішчыц // Выбранае. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2000. – С. 30.
2. Янішчыц, Я. Кахання сад і ластаўка вясны / Яўгенія Янішчыц // Каліна зімы. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1987. – С. 162.

# Лагішынская
# гарпасялковая
# бібліятэка









## *Тэатралізаванае прадстаўленне вершаў Яўгеніі Янішчыц*
## *"У калыханку сыну" і "Ты вучыла мяне сеяць жыта і лён"*

**Афармленне залы:** *на сцэне ўстаноўлены дэкарацыі і партрэт Яўгеніі Янішчыц. Афомлена кніжная выстава "Звонкая ліра паэткі". Ціха гучыць музыка.*

**Чытальнік:**
Я думала, лёсам мне дадзена многа,
І многае, праўда, мне лёс падарыў:
Вось гэтую вечную ў вёску дарогу
І тую бярозку як памяць між ніў…

*Выходзіць жанчына з дзіцем на руках.*

**Жанчына:**
Свет мой – голенькі ды босы,
Мой бялюткі бацянок,
Засынаеш, як дарослы, –
Пад галоўку кулачок.

Спі... Зырчэйшая за лотаць
Узышла зара ў акне.
Хто нас можа запалохаць,
Калі ты ўсміхнуўся мне?

І сама я на паўслове
Заціхаю. Ноч... Спакой...
Спі, твой ранначак ружовы
І блакітны вечар твой.

Спі, мой сыне, спі, мой болю,
Спі, крыло майго жыцця...
Я й сама цяпер з табою,
Як вясёлае дзіця.

*Янішчыц, Я. У калыханку сыну / Яўгенія Янішчыц // Дзень вечаровы. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1974. – С. 57.*

**Вядучы:** Значная частка вершаў паэтэсы прысвечана маці…

Што за восень даўняя,
Аніяк не сплыве
Там за полем, за гаем
Мая мама жыве.

*(выходзіць дзяўчына, трымаючы ў руках клубок нітак)*

**Дзяўчына:**
Ты вучыла мяне сеяць жыта і лён

І цярплівасці вечнай - уголас не плакаць.
Апынуся калі сярод чорных варон, -
Я памру, ды не буду па-іхняму каркаць.

Вось трывожна вядзерца нясу, як тады,
Як вучыла, нясу. Я нясу, каб суседка
Не сказала, што нават звычайнай вады
Прынясці не умее, не заліўшы сукенку.

Цвёрда мною завучан натруджаны крок
Твой,
        якому павек ужо не саступіцца.
І душа мая чыста, нібы матылёк,
На агонь вылятае, ды агню не баіцца.

Пішаш: «Век мой пражыты. Наперадзе - твой.
За мяне не хвалюйся. Я буду здаровай
Да апошняй вячэрняй зары палявой
І грыбочка апошняга ў нашай дуброве».

Мама, сею не жыта я, сею не лён.
Але з лёну і жыта я словы складаю.
І калі углядаюся ў парасткі дзён —
Чую крокі твае. І свае вымяраю.

Не дакарала, не журыла
Ні ў цішы, ні пры гасцях.
…Клубочак з лёну ўпусціла
Матуля ціха мне на шлях.

*Янішчыц, Я. Ты вучыла мяне сеяць жыта і лён / Яўгенія Янішчыц // Ясельда. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1978. – С.22.*

*Дзяўчына выпускае з рук клубочак нітак і ён каціцца па сцэне.*
*Дзяўчына пакідае сцэну.*

Спіс выкарыстанай літаратуры:


1. Яўгенія Янішчыц: творы, жыццяпіс, каментарыі / уклад.: С.У. Калядка, Т.П. Аўсяннікава. – Мінск: Беларуская навука, 2016. – Т.1. – С. 114-133.
2. Янішчыц, Я. Ты вучыла мяне сеяць жыта і лён / Яўгенія Янішчыц // Ясельда. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1978. – С. 22.
3. Янішчыц, Я. У калыханку сыну / Яўгенія Янішчыц // Дзень вечаровы. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1974. – С. 57.

# *Плешчыцкая сельская бібліятэка*








## *Тэатралізаванае прадстаўленне верша Яўгеніі Янішчыц "Прыедзь у край мой ціхі" і паэмы "Ягадны хутар"*

**Афармленне залы:** *сцэна ўпрыгожана кветкамі, у цэнтры – партрэт Я.Янішчыц. Гучыць беларуская народная музыка. Тэатралізацыя суправаджаецца электроннай прэзентацыяй. На фоне музыкі і прэзентацыі гучыць верш Я.Янішчыц "Прыедзь ў край мой ціхі…".*

**Хлопчык:**
Прыедзь у край мой ціхі,
Тут продкаў галасы,
Тут белыя буслiхi
I мудрыя лясы.

Хапае на Палессі
I сонца, і вады.
I што ні двор - то песня,
Што вёска - то сады.

Па травах светла-шызых
Мы пройдзем ля ракі,
Дзе, мыючы бялізну,
Вядуць сваё жанкі.

I будзе песня спета
Пра шчасце і бяду,
I будзе падаць лета
Ў гуллівую ваду.

Прыедзь у край мой ціхі,
Тут продкаў галасы.
Тут белыя буслiхi
I мудрыя лясы.

*Янішчыц, Я. Прыедзь у край мой ціхі / Яўгенія Янішчыц // Выбранае. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2000. – С. 21.*

*Выходзяць жанчыны і дзяўчына.*

**Дзяўчына:**
Па гладкай шашы, па сцяжыне
Дарога вяртае дамоў.
На кожнай кудлатай хваіне
Птушыны распеў галасоў.

**Жанчына першая:**
Нядаўна пад стол гэты пешкам…
**Жанчына другая:**

“Нядаўна” – маланкаю час.

**Аўтар:**
Жанкі ад пітва захмялеўшы,
Самоту разгоніць у раз.

**Жанчына першая:**
А помніш, у школу хадзілі
За рэчку? Забыўны быў час…

**Жанчына другая:**
А помніш Аўдзеева Дзіму?
Цяпер старшынёю ў нас.

**Жанчына першая:**
А Волька, што з горам – дзесяты,
У Мінску. Забыла на дом.
І хоць бы Матрунцы – на свята
Сустрэнеш яе – прысаром

**Жанчына другая:**
А гэты, што з Ведрына, лысы,
Ну як жа яго?! Шныпаркоў!
Адбіў у Валодзькі Марысю.
І трэба ж: любоў без зубоў!

**Жанчына першая:**
Не Гэля – мужык у спадніцы,
Пілуе сама круглякі.

**Жанчына другая:**
А чулі: Казла з Асаўніцы
Заштрапілі за кругляківі.
Вядома, глушыў, як шалёны.
А сквапнасць не ведае меж.

**Жанчына першая:**
На кніжцы відаць паўмільёна!
На крадзеным – не пражывеш.

**Жанчына другая:**
Прыслалі загадчыцу клуба,
Дзяўчына нішто. Ды дыміць.
Ох, модачка на цыгарэты,
Куды ж яна дзевак звяла…

**Дзяўчына:**
Шчабечуць да поўні кабеты –
Сумленне й трываласць сяла.

*Янішчыц, Я. Ягадны хутар / Яўгенія Янішчыц // Выбранае. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2000. – С. 280-295.*

Спіс выкарыстанай літаратуры:


1. Янішчыц, Я. Прыедзь у край мой ціхі / Яўгенія Янішчыц // Выбранае. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2000. – С. 21.
2. Янішчыц, Я. Ягадны хутар / Яўгенія Янішчыц // Выбранае. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2000. – С. 280-295.

# Валішчанская сельская бібліятэка







## *Тэатралізаванае прадстаўленне верша Яўгеніі Янішчыц*
## *“Ля ложка хворай маці”*

**Афармленне залы**: *побач са сцэнай афармлена кніжная выстава “Ясяльдзянка з палескага краю”.*

**Сцэна першая**

*Прывакзальная плошча. Прывакзальная лаўка, на якой складае ў авоську рэчы бабуля. Жэня Янішчыц, якая праходзіць якраз у той час побач, дапамагае сабраць.*

**Баба Маня:** Жэнька, хіба ж ты? Ой, як добра, што я цябе сустрэла, а то я ўжо думала, як ты тут?
**Жэня:** Ну я, а хто ж яшчэ? Баба Маня, а вы чаго тут?
**Баба Маня:** А што я?... Вось гасцінцаў прывезла ўнучцы.
**Жэня:** Вой, дык Вы можа раскажаце, што у нас там, у Велясніцы чуваць?
**Баба Маня:** А што чуваць? Да маці тваёй забягала, гасцінцаў заносіла, разумею, што хворай без вітамінаў ніяк….
**Жэня:** (перабівае) Як хворай? На што хворай? Што вы такое кажаце?
**Баба Маня:** Ой, Жэнька, дык ты што, нічога не ведаеш? Ой, язык мой… А я думала, ты ведаеш… Там нічога страшнага няма, яна папраўіцца…
**Жэня:** Прабач, родная, прабач, не, я лепей пайду. Дзе толькі тут бліжэйшы таксафон? Бывай, баба Маня, бывай…

**Сцэна другая.**

*Сцэна афармлена ў выглядзе пакоя кватэры Яўгеніі Янішчыц.*
*Стаіць стол і крэсла.*

**Жэня:** Ой, мама, мамачка… Ці ж я магла ведаць… А цяпер… І паехаць не магу і дапамагчы табе ні ў чым не ў стане… Ой, мама, мамачка… А зараз я пісьмо напішу…

*Жэня сядае за стол і разважаючы пачынае пісаць…*

**Жэня:** Ну вось. Думала пісьмо напісаць, а напісала верш табе, мама…
Ты ляжыш не на ложку,
а ў жытневым полі.
Мама!
Так мне рукі твае не балелі ніколі.
То пасланы ў пакоі не ходнікі —
саматканыя сцежкі-дарогі.
Мама!
Так ніколі твае не балелі мне ногі.
Я прыйшла, як заўжды, цішынёю тваёю сагрэцца.
Мама!
Так ніколі тваё не шчымела мне сэрца.

І ружовіцца дзень.
І жыты ўжо чакаюць за хатай,
А табой за паўвека так многа жытоў перажата!..
Ты на ложку ляжыш,
А здаецца, што ў сонечным полі.
Мама!
Так ніколі твая не балела мне доля.
Ты на ложку ляжыш.
І прыціхла за хатай дуброва.
Мама!
Так ніколі, як сёння,
Тваё
Не балела мне слова.

*Янішчыц, Я. Ля ложка хворай маці / Яўгенія Янішчыц // Выбранае. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2000. – С. 175.*

*(кладзе ліст у канверт і адрасуе)*

**Жэня:** Ну, вось і ўсё, мая мамачка, дабранач!

Спіс выкарыстанай літаратуры:


1. Янішчыц, Я. Ля ложка хворай маці / Яўгенія Янішчыц // Выбранае. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2000. – С. 175.
2. Яўгенія Янішчыц: творы, жыццяпіс, каментарыі / уклад.: С.У. Калядка, Т.П. Аўсяннікава. – Мінск: Беларуская навука, 2016. – С. 88.

# Стытычаўская сельская бібліятэка







## *Тэатралізаванае прадстаўленне верша Яўгеніі Янішчыц*
## *“Ты пакліч мяне. Пазаві”*

**Афармленне залы:** *сцэна упрыгожана ў нацыянальным стылі. Ціха гучыць музыка. На сцэну выходзяць дзяўчына і хлопец.*

**Хлопец:**
Ты пакліч мяне. Пазаві.
Там заблудзімся ў хмельных травах.
Пачынаецца ўсё з любві,
Нават самая простая ява.
**Дзяўчына:**
І тады душой не крыві
На дарозе жыцця шырокай.
Пачынаецца ўсё з любві –
Першы поспех і першыя крокі.
**Хлопец:**
Прыручаюцца салаўі,
І змяняюцца краявіды
Пачынаецца ўсё з любві –
Нават ненавісць і агіда...
**Дзяўчына:**
Ты пакліч мяне. Пазаві.
Сто дарог за маімі плячыма,
Пачынаецца ўсё зь любві,
А інакш і жыць немагчыма.

*Янішчыц, Я. Ты пакліч мяне. Пазаві / Яўгенія Янішчыц // Выбранае. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2000. – С. 186.*

Адказны за выпуск А.І.Анташук

Складальнік,
камп’ютарны набор і
афармленне К.Л.Міхалевіч

225 710
г. Пінск
вул. ІПД, 35
тэл.: 31 60 15, факс 31 61 36
эл. пошта: crbpinsk@tut.by